*Н. В. КАРПОВІЧ*

# АРГАНІЗАЦЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПРАВАСЛАЎНАГА ПРЫХАДСКОГА ДУХАВЕНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX ст.

Праваслаўнае духавенства было адной з тых саслоўных груп, якія з'яўляліся гарантам стабільнасці сацыяльнай сістэмы Расійскай імперыі. Асноўную масу духоўнага саслоўя складала прыхадское духавенства. Яго функцыі і становішча ў грамадстве ў другой палове XIX — пачатку XX ст. вызначаліся кананічным правам, але ў той жа час і задачамі па рэалізацыі ўрадавых праектаў і рашэнняў. Змены ва ўрадавай палітыцы ў нацыянальна-культурнай сферы ў накірунку русіфікацыі значна пашырылі межы дзейнасці духавенства. Новыя задачы патрабавалі перагляду пазіцый духавенства, звязаных з вызначэннем яго сацыяльнага статусу, у тым ліку і з пытаннямі матэрыяльнага забеспячэння. Пераход да ўзмоцненай русіфікацыі паскорыў правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне становішча праваслаўнага духавенства наперш у заходніх губернях. Гэта вызначыла спецыфічныя ўмовы арганізацыі гэтай працы тут у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

У дадзеным артыкуле аналізуецца арганізацыя матэрыяльнага забеспячэння праваслаўнага духавенства ў беларускіх губернях у другой палове XIX — пачатку XX ст. У сучаснай гістарыяграфіі праз прызму характарыстыкі канфесійнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ў працах В. Яноўскай [22], Т. Апіёк [15] знайшлі адлюстраванне асобныя аспекты па абазначанай праблеме, але сістэма і спецыфіка арганізацыі матэрыяльнага забеспячэння прыхадскога духавенства ў іх атрымала фрагментарнае асвятленне.

Да пачатку 60-х гг. XIX ст. сістэма матэрыяльнага забеспячэння прыхадскога духавенства Беларусі складалася з некалькіх крыніц утрымання: казённага жалавання, забеспячэння зямельнымі надзеламі і жыллёвымі памяшканнямі, дапаможных царкоўных сродкаў. Дадзеная сістэма канчаткова афармілася і рэгулявалася Палажэннем 1842 г. Ім было ўведзена казённае жалаванне духавенству ў прыходах заходніх губерняў.

---

**Карповіч Наталля Валер'еўна** — выкладчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

---

Яго памер залежаў ад класа прыхода, які, у сваю чаргу, вызначаўся колькасцю прыхаджан. Усе прыходы падзяляліся на сем класаў, і адпаведна з імі вызначаліся штатныя памеры кожнага з іх. У штатны расклад уваходзіла ад 2 да 7 чалавек з ліку свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў. Памер жалавання ў залежнасці ад класа прыхода вагаўся ад 140 да 544 руб. у год. Большую частку ад гэтай сумы атрымлівалі святары. Велічыня аклада кожнага з іх складала ад 100 да 180 руб. штогод [2, л. 37]. У той жа час, па некаторых падліках, на ўтрыманне сям'і святара з пяці чалавек неабходна было прыкладна 800 руб. штогод [7, с. 380]. З-за існавання дэфіцыту бюджэтных сродкаў забеспячэнне прыхадскога духавенства адбывалася толькі ў палове прыходаў Расійскай імперыі. Але духавенства заходніх губерняў у ліку першых атрымлівала грашовыя аклады, на якія ў 1862 г. выдаткоўвалася трэць прызначаных на гэтыя патрэбы сродкаў у агульным аб'ёме больш за 1 млн руб. у год. Прынцыпы прызначэння жалавання духавенству ў наступныя дзесяцігоддзі істотна не змяніліся, аднак памеры яго павялічыліся праз выкарыстанне сродкаў кантрыбуцыйных збораў пасля 1863—1864 гг.

Палажэннем 1842 г. рэгулявалася забеспячэнне духавенства зямельным участкам з боку прыхаджан. Зямля належала прыходу і давалася ў карыстанне духавенству падчас яго службы ў прыходзе. Паводле Палажэння духавенству ў вясковых і гарадскіх прыходах, у якіх пражывала не менш за 100 асоб з ліку вяскоўцаў-мужчын, выдзяляўся ўчастак у памеры 33 дзесяцін сядзібнай, ворыўнай зямлі і сенакосу. На самой справе з-за абмежаванасці зямельных рэсурсаў часта было складана забяспечыць святароў належным надзелам. У выніку зямельны ўчастак атрымалі святары толькі ў 60 % прыходаў заходніх епархій [22, с. 28]. Акрамя таго, атрыманая ў карыстанне зямля нярэдка была не лепшай якасці і не адпавядала ўстаноўленаму памеру, таму прыхаджанам прыходзілася дадаткова выплачваць натуральныя павіннасці альбо грашовыя. Іх выкананне прызначалася замест апрацоўкі зямлі святарам. Трэба ўлічваць, што толькі ім сяляне апрацоўвалі зямельны ўчастак, памер якога складаў 10 дзесяцін. Выдзяленне зямлі царкоўным прычтам працягвалася да канца XIX ст.

У абавязак прыхаджан уваходзіла будаўніцтва для духавенства ў прыходах жыллёвых памяшканняў, іх рамонт і забеспячэнне палівам. Паводле спецыяльна распрацаванага плана, духавенства забяспечвалася жыллём на час службы ў залежнасці ад займаемай пасады. Святару належала мець дом з трыма пакоямі, дыякану — з двума пакоямі, дадаткова да іх прыбудоўваліся кухня і гаспадарчыя памяшканні. Жыллё для

царкоўнаслужыцеляў было менш уладкаваным, яны карысталіся аднапакаёвым памяшканнем. Але забеспячэнне духавенства жыллём выконвалася часткова, амаль палова пабудоў не адпавядала ўстаноўленым патрабаванням. У вырашэнні гэтага пытання было шмат складанасцей, што ў выніку змяніла прынцыпы яго арганізацыі.

У забеспячэнні прыхадскога духавенства асобую групу складалі царкоўныя даходы. Яны фарміраваліся з добраахвотных ахвяраванняў, з кружачных і кашальковых збораў, з прыбыткаў ад крэдытных і арэндных капіталаў з зямлі і маёмасці. Аднак гэтая крыніца значнага прыбытку духавенству Беларусі не прыносіла. З аднаго боку, беднасць прыхаджан, з другога — расходы на царкоўныя патрэбы зніжалі даходы духавенства. Царкоўныя даходы падзяляліся паміж членамі прычта ў залежнасці ад службовага стану і ад колькасці служачых у штаце. Каб папярэдзіць непаразуменні і не дапусціць спрэчак, былі выдадзены ў 1873 г. правілы для падзелу збораў. Паводле іх святар атрымліваў 75 % усяго прыбытку, псаломшчык — 25 % прыбытку. У прычтах з трох чалавек доля святара змяншалася і складала каля 66 % прыбытку. Астатняя частка даходаў размяркоўвалася паміж іншымі служачымі [22, с. 34]. У той жа час існавалі прыходы, у якіх колькасць штатных адзінак не была ўлічана ў правілах. Гэта акалічнасць стала следствам зменаў у структуры прыходаў. Прыхадскімі цэрквамі кіравалі не толькі святары-настаяцелі, але і іх памочнікі. Нярэдка менавіта памочнікі святароў заставаліся незадаволенымі памерам іх даходу. Так, напрыклад, памочнік святара Петрапаўлаўскага сабора ў Гомелі з-за нявызначанасці ў правілах велічыні яго долі прыбытку нават дабіўся яе павелічэння [16, л. 24—26]. Дазвол у 1885 г. на аднаўленне прыходаў і штатных адзінак вымусіў улады перагледзець правілы для размеркавання даходаў. У іх аснову быў пакладзены наступны прынцып: святар атрымліваў 3 часткі даходу, дыякан — 2 часткі, псаломшчык — 1 частку, аднак ізноў не былі ўлічаны ўсе асаблівасці структуры прыходаў. У гэтай сувязі мясцовым уладам даводзілася іх адаптаваць. Напрыклад, калі ў Мінскай губерні настаяцель царквы ў Міры раней атрымліваў даход ад арэнды зямлі на 1/7 больш, чым яго памочнік, то пасля 1885 г. яны ўжо атрымлівалі прыбытак па чарзе, праз год [12, л. 43].

Змены ў арганізацыю матэрыяльнага забеспячэння прыхадскога духавенства Беларусі ўнеслі царкоўныя рэформы 60—70-х гг. XIX ст. Гэтым пытаннем у межах Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Беларусі, займалася спецыяльна створаная ў 1862 г. Асобая прысутнасць. У прыватнасці, гэта ўстанова дабілася прызначэння дадатковага жалавання духа-

венству Беларусі і сумарна выдзеліла на такія патрэбы 115 тыс. руб. [6, с. 98]. З іх 65 % адлічвалася духавенству Літоўскай епархіі, якое лічылася пацярпелым ад паўстання [падлічана па: 18]. Акрамя таго, ім у якасці аднаразовай дапамогі выдзялялася 42 тыс. руб. [6, с. 99]. Большую частку гэтай сумы атрымала духавенства разам з іх сем'ямі, якія пражывалі ў межах Гродзенскай губерні [1, л. 11]. Сродкі 5 % кантрыбуцыйнага збору дазволілі палепшыць становішча духавенства Беларусі. У 1864 г. з прызначанай сумы ў памеры 400 тыс. руб. духавенства ў Літоўскай епархіі атрымала 99 866 руб., у Магілёўскай — 110 266 руб. 37 кап., у Мінскай — 113 211 руб. 70 кап., Полацкай — 65 240 руб. 62 кап. — усяго 388 584 руб. 69 кап. [6, с. 98; 4, л. 161]. Акрамя таго, на гэтыя сродкі дазвалялася прызначаць у прыходах дадатковыя штатныя адзінкі. Выдаткаваныя грашовыя сродкі дазволілі павялічыць памеры акладаў праваслаўнага духавенства ў 1864 г. амаль удвая. Святары ў гарадскіх прыходах атрымалі па 400 руб., у вясковых — не менш за 220 руб. у год [4, л. 161].

Падчас царкоўных рэформ 60—70-х гг. XIX ст. было ўзмоцнена фінансаванне духавенства заходніх епархій. За выключэннем епархіальных архіерэяў, жалаванне якіх захавалася адзінае — 4000 руб. у год кожнаму, павялічылася сума на ўтрыманне дапаможнага персаналу архіерэйскіх дамоў у Літоўскай епархіі да 5000 руб. у год, у астатніх — 4350 руб. у год. У той жа час на персанал гарадскіх кафедральных сабораў выдаткоўвалася ў Літоўскай епархіі — 3800 руб. у год, у Магілёўскай, Мінскай, Полацкай — 2300 руб. на кожную [3, с. 220]. Гэта, у сваю чаргу, выклікала неабходнасць павелічэння акладаў духавенства ў гарадскіх і вясковых прыходах. Сродкі на гэтыя выплаты прызначыліся ў памеры 184 тыс. руб. [22, с. 31]. Іх збіралі ў якасці пазямельнага збору з насельніцтва беларускіх губерняў. Адначасова прыхаджане вызваляліся ад выканання натуральных павіннасцей на карысць духавенства. Але не ўсе святары былі задаволены іх адменай. Як следства, на паседжаннях епархіяльных з'ездаў яны адзначалі пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча ў сувязі з адменай натуральных павіннасцей [5, с. 201]. Але ў пачатку 70-х гг. XIX ст. духавенства атрымала прыбаўку да жалавання. У гарадскіх прыходах оклад протаіерэя складаў — 600 руб.у год, святара — 500 руб., дыякана — 300 руб., протадыякана — 200 руб., прычэтніка — 150 руб. штогод. Узровень жалавання духавенству ў вясковых прыходах быў устаноўлены ў наступных памерах: святару — 400 руб. у год, дыякану — 120 руб., прычэтніку — 96 руб. у год [3, с. 220]. Так, напрыклад, толькі ў Мінскай епархіі оклады ўстаноўленай велічыні атрымалі ў гарадскіх прыходах: 9 протаіерэяў, 18 святароў, 14 дыяканаў, 33 прычэтнікі; у вяско-

вых: 526 святароў, 41 дыякан, 830 прычэтнікаў [3, с. 220]. Акрамя таго, па ініцыятыве архіерэяў была зменена сістэма выплаты акладаў. Так, напрыклад, у Літоўскай епархіі з 1873 г. яны выдаваліся штомесячна [5, с. 197].

У рамках царкоўных рэформ 60—70-х гг. XIX ст. Асобай прысутнасцю было распрацавана палажэнне, паводле якога вырашылі скараціць у межах Расійскай імперыі штатныя адзінкі духавенства, а сродкі накіраваць на паляпшэнне пакінутага на службе духавенства. У Беларусі за кошт свабодных сум планавалася ў першую чаргу павялічыць жалаванне на 20 % духавенству кафедральных сабораў у Літоўскай, Мінскай, Полацкай епархіях [22, л. 1]. Прыбаўку ў памеры 15 руб. разлічвалі атрымаць царкоўнаслужыцелі ў гарадскіх прыходах. Устанаўліваліся новыя аклады для духавенства ў вясковых прыходах: святару — 408 руб., псаломшчыку — 122,40 руб. [21, л. 22]. Але на справе атрымалася, што скарачэнні духавенства былі нязначныя. Мясцовыя архіерэі, скарыстаўшыся нявызначанасцю палажэння, адкрылі царкоўных прыходаў болей, чым існавала раней, што патрабавала павелічэння колькасці святароў. Колькасць месцаў прычэтнікаў скарацілася амаль на трэць, але да ўладкавання на новае месца на працягу яшчэ двух месяцаў яны заставаліся на былым забеспячэнні. На самой справе атрымалася, што ў цэлым на запланаваныя змены ў структуры прыходаў нават патрабуюцца дадатковыя сродкі. Так, у Мінскай епархіі іх дэфіцыт складаў больш за 4000 руб. [падлічана па: 21, с. 22], а ў Літоўскай епархіі — больш за 15 000 руб. [падлічана па: 10, с. 122]. З-за абмежаванасці грашовых сродкаў было вырашана выплаціць прыбаўку да жалавання царкоўнаслужыцелям з семінарскай адукацыяй, а астатнім — захоўваліся былыя аклады.

З пачатку 80-х гг. XIX ст. у арганізацыі забеспячэння духавенства акладамі ўрад імкнецца вярнуцца да выдзялення сродкаў з казны. Спачатку дадатковыя сродкі накіроўваліся ў тыя епархіі Расійскай імперыі, дзе выплачвалася жалаванне, у тым ліку і ў Беларусі. З 1882 г. ім дазвалялася рэшткі ад фінансавання духавенства ў гарадскіх і вясковых прыходах, якія раней вярталіся ў дзяржаўную казну, выкарыстоўваць на выплату датацый духавенству. Так, напрыклад, у 1884 г. кіраўніцтва Літоўскай епархіі выплаціла надбаўку да жалавання царкоўнаслужыцелям. Яе памер псаломшчыкам у гарадскіх прыходах складаў 14 руб. штогод, у вясковых — звыш 23 руб. штогод [ 8, с. 119]. У той жа час у 1885 г. спыніла сваю дзейнасць Асобая прысутнасць, галоўнай задачай якой з'яўлялася скарачэнне колькасці прыходскога духавенства з мэтай паляпшэння яго матэрыяльнага становішча. А на адкрыццё новых штатных месцаў пат-

рабаваліся дадатковыя асігнаванні, якіх не заўсёды хапала. Напрыклад, у Літоўскай епархіі ў 1892 г. аклады не выплацілі своечасова васьмі святарам — па 400 руб. штогод, шасці псаломшчыкам — па 120 руб. штогод кожнаму [9, с. 174].

На мяжы XIX — пачатку XX ст. была перагледжана сістэма казённага ўтрымання. Урад імкнуўся аказаць грашовую дапамогу духавенству ва ўсіх прыходах Расійскай імперыі. Мэтай было прызначэнне акладаў наступнага памеру: святару — 600 руб., дыякану — 300 руб., псаломшчыку — 200 руб. штогод [17, с. 3]. Аднак дэфіцыт сродкаў не дазволіў рэалізаваць запланаваныя выплаты ў поўным аб'ёме. У 1893 г. сярэдні памер жалавання прыхода ў межах Расійскай імперыі складаў каля 400 руб. штогод [ падлічана па: 20]. У Беларусі за кошт чарговага павелічэння грашовых датацый гэты паказчык быў больш за агульнарасійскі і складаў каля 615 руб. штогод [падлічана па: 20]. Працэс павелічэння выдаткавання сродкаў на ўтрыманне духавенства беларускіх губерняў працягваўся.

Неад'емнай часткай казённага забеспячэння была пенсійная дапамога. Праваслаўнае духавенства заходніх губерняў у ліку першых адлічала 2 % са свайго заробку ў пенсійны фонд. Сумарны памер адлічэнняў дазваляў выплаціць пенсійную дапамогу абмежаванай частцы духавенства і пераважна з ліку святароў заходніх губерняў. Але пенсіі для абазначанай катэгорыі выдаткоўваліся несвоечасова, іх памер не быў нават зацверджаны, што выклікала істотныя змены ў фарміраванні пенсійнай сістэмы забеспячэння. З 1866 г. пачалі прызначаць фіксіраваныя пенсіі духавенству ў памеры 70 руб. штогод [19, с. 418]. Паводле пенсійнага статута ў спіс пенсіянераў была ўключана абмежаваная група асоб. Пенсію атрымлівалі толькі святары, якія мелі 35-гадовы працоўны стаж. Але ў Беларусі ў якасці аднаразовай дапамогі датацыі выплацілі і іншым катэгорыям заштатнага духавенства. Максімальны памер пенсій быў вызначаны наступны: пратаіерэю і святару — 70 руб., дыякану — 50 руб., прычэтніку — 30 руб. [19, с. 420]. У 1870 г. духавенства Літоўскай епархіі на гэтыя патрэбы атрымала суму ў памеры 1250 руб. [14, с. 540]. Пачынаючы з 80-х гг. XIX ст. у арганізацыі матэрыяльнага забеспячэння духавенства змяняецца сістэма выплаты ім пенсійнай дапамогі. З 1887 г. памер сумы на пенсійнае забеспячэнне вызначаўся ў адпаведнасці з колькасцю клірыкаў-пенсіянераў, што дазволіла пенсіі выплачваць рэгулярна і своечасова. Былі павялічаны памеры пенсіі святарам да 130 руб. штогод, у лік пенсіянераў з правам атрымання пенсійнай дапамогі былі ўключаны дыяканы. Памер іх пенсіі складаў 65 руб. у год [19, с. 419].

Але пенсійная дапамога не ахоплівала ўсе катэгорыі духавенства, нават у Беларусі, дзе яна прызначалася ў першую чаргу, прыходзілася дадаткова карыстацца сродкамі з епархіяльных пенсійных кас.

У забеспячэнні духавенства зямельнымі ўчасткамі адбыліся наступныя змены. Працэс надзялення зямлёй паскорыла прыняцце пастановы ў 1872 г. Яна ўключала былыя правілы надзялення зямлёй, а таксама ўлічвала распараджэнні, выдадзеныя ў перыяд паўстання 1863—1864 гг. Духавенству дазвалялася набываць зямлю звыш устаноўленага памеру, што значна павялічвала агульную плошчу царкоўнага землеўладання. Паводле дадзеных пазямельнага абследавання, яго прырост у пяці беларускіх губернях з 1877 па 1905 г. складаў 21 421 дзесяціну [15, с. 129]. Аднак гэта не выключыла існаванне прыходаў, у якіх памер зямельнага ўчастка быў меншы за ўстаноўлены. Так, напрыклад, у 1896 г. у трох паветах Мінскай губерні (Бабруйскім, Мінскім і Пінскім ) з 187 прыходаў памер зямельнага ўчастка не адпавядаў у 23 [13, л. 6].

У той жа час была перагледжана сістэма забеспячэння духавенства жыллёвымі памяшканнямі. З павелічэннем акладаў на духавенства накладваўся абавязак адлічваць пэўны працэнт з заробкаў на ўтрыманне асобага фонду на рамонт і будаўніцтва памяшканняў. Духавенства ж у большай ступені разлічвала на дапамогу прыхаджан, таму не спяшалася адлічваць працэнт са сваіх уласных сродкаў у рамонтна-будаўнічы фонд. Аднак паводле прынятых у 1872 г. правілаў рашэнне аб будаўніцтве жыллёвых памяшканняў прыхаджанамі прымалася на міравых з’ездах і пасля зацвярджалася губернскімі ўладамі. Але пры складанні актаў аб неабходнасці будаўніцтва памяшканняў у прыходах міравым пасрэднікам не заўсёды ўдавалася дасягнуць кампрамісу паміж духавенствам і памешчыкамі, што стрымлівала працэс вырашэння жыллёвага пытання. У канцы 70-х гг. XIX ст. у Мінскай епархіі з 490 прыходаў акты былі складзены ў 209, а зацверджаны толькі ў 82. У Гродзенскай губерні Літоўскай епархіі з 304 прыходаў акты былі складзены ў 185, зацверджаны — 94. У Магілёўскай епархіі ўвогуле не было складзена актаў [19, с. 392—393]. Нават у пачатку 80-х гг. XIX ст. справа не была вырашана. У 1883 г. у Віцебскай губерні з 54 прыходаў толькі ў 31 было распачата будаўніцтва прычтавых памяшканняў [11, с. 96]. Урад быў вымушаны прынцыпова змяніць падыходы да гэтага пытання і даручыў духавенству самастойна вырашаць жыллёвую праблему. На гэтыя патрэбы на паседжаннях міравых з’ездаў была вызначана сума, памеры якой дазвалялі забяспечыць жыллём усё духавенства, якое мела ў гэтым патрэбу. Гэту суму пачалі збіраць з 1889 г. у якасці пазямельнага збору з насельніцтва беларускіх

губерняў. З гэтага часу прыхадское духавенства атрымлівала грашовыя сродкі і наймала працаўнікоў для будаўніцтва і рамонту жыллёвых памяшканняў.

Арганізацыя матэрыяльнага забеспячэння прыхадскога духавенства Беларусі было адным з галоўных пытанняў канфесійнай палітыкі ўраду. Менавіта духавенству адводзілася галоўная роля ў рэалізацыі ўрадавых праграм. Нават дэфіцыт бюджэтных сродкаў не спыніў выплату яму казённага жалавання, якое пачынае займаць дамінуючае месца ва ўтрыманні духавенства. Нягледзячы на праяўленне незадаволенасці з боку духавенства вынікамі існуючай сістэмы забеспячэння, яго дабрабыт узрастаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ведомость о назначении и выдаче пособий православному духовенству Гродненской губернии в 1864 г. // Нацыянальны гістарычны архіў у Гродна. Ф. 135. Воп. 1. Спр. 257.

2. Дело об обеспечении содержанием духовенства в Минской епархии в 1864 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30938.

3. Дело о распределении сумм, отпускаемых из казны на содержание церковных причтов северо-западных епархий с 1 января 1870 г. // Минские епархиальные ведомости. 1870. № 17. С. 220.

4. Дело об увеличении содержания духовенства в 1865 г. // НГАБ. Ф. 96. Воп. 10. Спр. 11.

5. *Извеков, Н. Д.* Статистическое описание приходов Литовской епархии / Н. Д. Извеков. Вильна, 1893.

6. *Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. М. : Наука, 2005. 380 с.

7. *Корев, А.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба: Виленская губерния / А. Корев. СПб. : Тип. Огризко, 1861.

8. Местные распоряжения о выдаче дополнительного жалования псаломщикам Литовской епархии // Литовские епархиальные ведомости. 1892. № 5.

9. Местные распоряжения об открытии в некоторых приходах мест вторых священников // Литовские епархиальные ведомости. 1892. № 21—22. С. 174—175.

10. Местные распоряжения по поводу расписания приходов и причтов Литовской епархии // Литовские епархиальные ведомости. 1876. № 16.

11. Обеспечение православных причтов постройками // Обзор Витебской губернии за 1889. Витебск, 1890. С. 96.

12. Об изменении некоторых поступлений в 1885 г. // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35986.

13. Об окончательном наделе сельских причтов Минской епархии в1896 г. // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36269.

14. О назначении пособий заштатному духовенству Литовской епархии // Литовские епархиальные ведомости. 1870. № 14.

15. *Опиок, Т. В.* Экономическое положение православных приходов и материальное обеспечение приходского духовенства белорусских земель во второй половине XIX в. /

Т. В. Опиок // Романовские чтения — 5: сб. тр. междунар. науч. конф., 27— 28 нояб. 2008 г., г. Могилев / редкол.: Н. М. Пурышева (председатель) [и др.]. С. 128—130.

16. О разделе кружечного сбора и земельных угодий между членами причта Гомельской Петропавловской церкви 1873—1885 гг. // НГАБ. Ф. 3022. Воп. 1. Спр.65.

17. Подробные сведения о положении дела по обеспечению содержанием городского и сельского духовенства в Российской империи. СПб. : Изд. ведомств. правосл. исповед. хоз. управл. при Св. Синоде, 1899.

18. Пособия православному духовенству Литовской епархии // Литовские епархиальные ведомости. 1863. № 17. С. 627—628.

19. *Римский, С. В.* Российская церковь в эпоху Великих реформ: (Церковные реформы в России 1860—1870-х гг.) / С. В. Римский. М. : Крутиц. патриаршее подворье и др., 1999. 567 с.

20. Сведения, предоставленные благочинными для составления годового отчета 3-го благочинного округа игуменского уезда 1896 г. // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36626. Л. 1—43.

21. Указ Минской Духовной Консистории от 9 августа 1876 г. о новом расписании на производство содержания священно-церковнослужителям приходов и причтов Минской епархии // НГАБ. Ф. 96. Воп. 8. Спр. 166.

22. *Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі 1863—1914 гг. / В. В. Яноўская. Мінск : БДУ, 2002.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

В статье анализируются особенности организации материального обеспечения православного приходского духовенства Беларуси во второй половине XIX — начале XX в. Определены основные источники содержания духовенства, выявлены их изменения, указаны специфика и механизмы распределения доходов среди приходского духовенства. Отмечается улучшение материального обеспечения духовенства Беларуси.

The article analysis the special features of the organization of material security Orthodox parish clergy in Belarus during the second half of the $19^{th}$ century through the beginning of the $20^{th}$ century. The various sources of clergy’s maintenance are defined. Specific and mechanisms of distribution of the incomes among parish clergy are pointed. It is noted that clergy’s material security in Belarus was improved.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28 ліпеня 2011 г.